№76 (1639)

Пятніца, 25 красавіка 2003 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць —
5 разоў у тыдзень

Кошт свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

Народная Воля

E-mail: nv@promedia.by
http://nv.promedia.by

Надвор'е

У Мінску сёння чакаецца: удзень — +4...+6, уначы — -5...-7; у Брэсце ўдзень — +7...+9, дождж, уначы — 0...+2; у Гродне ўдзень — +8...+10, уначы — -2...-4; у Віцебску ўдзень — +2...+4, уначы — -5...-7; у Гомелі ўдзень — +8...+10, уначы — -4...-6; у Магілёве ўдзень — +4...+6, уначы — -6...-8.

На астатняй тэрыторыі краіны малавоблачнае, без ападкаў надвор'е.

www.meteo.by

ПУЛЬС

Офіс вызначыў прыярытэты

Офіс АБСЕ у Мінску вызначыў чатыры асноўных напрамкі, на якія яго супрацоўнікі будуць звяртаць асаблівую ўвагу. Пра гэта паведаміла прэс-сакратар офіса **Хайдзі СМІТ,** якая з'яўляецца грамадзянкай Вялікабрытаніі.

Па яе словах, прыярытэтныя накірункі — гэта заканадаўства і інстытуцыянальнае будаўніцтва, грамадзянская супольнасць, эканоміка і навакольнае асяроддзе. Прэс-сакратар паведаміла, што ствараюцца адпаведныя рабочыя групы. Пры вызначэнні складу гэтых груп офіс працуе з беларускім урадам. Аднак Хайдзі Сміт сказала, што офіс зацікаўлены, каб у абмеркаванні праблем актыўна ўдзельнічалі і няўрадавыя арганізацыі Беларусі, і міжнародныя. Дзеля гэтага ўжо праведзены сустрэчы з прадстаўнікамі ПРААН — праграмы развіцця ААН, ЮНІСЕФ — дзіцячага фонду ААН, БДЗІПЧ — бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека.

Хайдзі Сміт сказала таксама, што збоку некаторых палітычных сіл і прэсы на адрас офіса ўжо была выказана крытыка за тое, што супрацоўнікаў АБСЕ не было бачна на апошніх акцыях апазіцыі і ў судах, якія адбыліся пасля гэтага. Паводле слоў Хадзі Сміт, офіс усё ж назіраў за сакавіцкімі акцыямі, адпаведныя матэрыялы пра іх накіраваны ў Вену. А вось адсутнасць супрацоўнікаў офіса на судовых працэсах прэс-сакратар патлумачыла чыста тэхнічнымі прычынамі. На той час у Мінск яшчэ не прыехаў супрацоўнік офіса, які адказвае за сферу правоў чалавека. Цяпер ён тут. Гэта грамадзянін Швецыі Вадзім Целін. Дарэчы, ён ужо прысутнічаў на судовым працэсе па справе Аксаны Новікавай. Ён жа будзе назіраць і за чарнобыльскай акцыяй.

Хайдзі Сміт паабяцала сустракацца з журналістамі штомесяц. Напрыканцы яна паведаміла, што чарговы візіт рабочай групы па Беларусі Парламенцкай Асамблеі АБСЕ, якую ўзначальвае Ута Цапф, запланаваны на 25—28 мая.

Уладзімір ГЛОД.

Мытнікі прыносяць вялікі прыбытак

У першым квартале года ад дзейнасці мытных органаў у рэспубліканскі бюджэт пералічана 380,7 млрд. рублёў. Пры гэтым кожны рубель, укладзены ў мытныя органы, даў дзяржаве 40,6 рублёў даходу.

Мытня па-ранейшаму застаецца адной з найбольш стабільных крыніц паступлення сродкаў у бюджэт краіны. Разам з тым адным з галоўных накірункаў у працы мытных органаў з'яўляецца праваахоўная дзейнасць. З гэтай прычыны асноўныя намаганні былі сканцэнтраваны на спыненні злачынных замахаў у сферы мытнай справы, абароне спажывецкага рынку, на выяўленні каналаў незаконнага перамяшчэння тавараў і транспартных сродкаў, кантрабанды наркотыкаў.

За першыя тры месяцы гэтага года аператыўнымі падраздзяленнямі выяўлена і спынена 4.112 злачынстваў і адміністрацыйных правапарушэнняў. Ацэначны кошт канфіскаваных у сувязі з парушэннямі мытнага заканадаўства тавараў і транспартных сродкаў склаў 40,5 млрд. рублёў. Спынена 9 спробаў кантрабанды наркотыкаў, пры гэтым канфіскавана звыш 6 кілаграмаў наркатычных сродкаў.

Аляксей АРЭШКА.

Злодзеяў і п'яніц будуць звальняць без згоды прафсаюза

Адміністрацыя аб'яднання "Беларуськалій" унесла ў праект калектыўнага дагавора спецыяльны пункт, які прадугледжвае звальненне без згоды прафсаюзнай арганізацыі наёмнага работніка, які ўчыніў крадзеж. Калі гэтая навацыя атрымае прававую сілу, у кіраўніцтва працоўнага калектыву з'явіцца пераканаўчы аргумент у яго барацьбе з "несунамі".

Як заявіў БелаПАН генеральны дырэктар ВА "Беларуськалій" Андрэй Башура, крадзеж на вытворчасці занадта дорага абыходзіцца прадпрыемству — даводзіцца ўтрымліваць больш за 400 чалавек аховы, якія штодзённа затрымліваюць дробных злодзеяў. Нясуць яны ўсё, што трапляе пад руку: ад пакета пральнага парашку і кавалка мыла да тросаў, кабеляў і электраматораў. У першым квартале колькасць затрыманых узрасла ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам у паўтара раза.

Паводле слоў А.Башуры, "гэтая з'ява не можа не здзіўляць, улічваючы салідныя ў параўнанні з іншымі прадпрыемствамі краіны заробкі рабочых аб'яднання. Напрыклад, на абагачальных фабрыках і ў дапаможных цэхах руднікоў людзі атрымліваюць на рукі ў залежнасці ад кваліфікацыі ад 350 да 500 тысяч рублёў, а непасрэдна шахцёры — 1-1,6 мільёна. Плюс дывідэнды, розныя сацыяльныя выплаты. І ўсё роўна, аказваецца, сяму-таму не хапае на мыла і электроды".

Ларыса НАСАНОВІЧ.

ЭХО ЧЕРНОБЫЛЯ

Цвети, Сад Надежды!

Таким, как на этом прошлогоднем снимке, мы увидим наш сад вскорости, в майские дни. В подвенечный наряд оденутся яблони и груши, заблагоухает аллея грецкого ореха, розовой кипенью зачарует цветущее чудо — японская вишня сакура...

Чтобы оказаться в этой радующей глаз и сердце сказке, не надо ехать за три моря. Здесь, в белорусской столице, на территории при церкви в честь иконы Божьей Матери "Всех скорбящих радость" еще в десятую годовщину чернобыльской катастрофы был заложен сад. Сад Надежды, сад Дружбы, в создании которого приняли участие гости Беларуси из 17 стран мира. Прихожу сюда — и вспоминаю все, как было: и саму трагедию, и связанную с ней неутихающую боль, и стремление одолеть беду во что бы то ни стало, отстоять жизнь на и без того исстрадавшейся белорусской земле.

Вспоминаю, как с первых же дней страшной, неведомой ранее навалы мы, научные работники радиационной лаборатории Белорусского института почвоведения и агрохимии, отправлялись в зараженные районы за образцами почвы и растений, как зашкаливало приборы в тех местах, где мы были и которые навсегда покидали, теряя родину, коренные здешние жители. Как мы пытались пробиться со своими обращениями-рекомендациями к тогдашним руководителям республики и страны, настоятельно требуя уберечь от радиации в первую очередь детей, бросить все силы и средства на спасение здоровья и жизни ни в чем не повинных граждан. Но вместо того, чтобы принимать чрезвычайные и продуманные меры, нас просто "футболили": мол, вас не спрашивают — и помалкивайте. Да разве только нас? Затыкали рот Алесю Адамовичу, многим ученым-атомщикам, знающим правду о том, какая глобальная катастрофа нас настигла и что это очень, очень надолго.

Минули годы, они принесли немало утрат и ран, связанных с Чернобылем. Но совестливые люди делали и делают все возможное и подчас невозможное, чтобы облегчить людские страдания, спасти будущее Беларуси — детей. Только на счету, к примеру, общественного фонда "Детям Чернобыля" Геннадия Грушевого немало содержательных благотворительных программ — своего рода символический сад Надежды. Только в плане оздоровления 130 тысяч маленьких белорусов из многодетных и малообеспеченных семей побывали на отдыхе и лечении за границей, почувствовали, что не брошены в беде.

И реальный сад Надежды в Минске — это тоже инициатива Геннадия Владимировича, которую поддержали многие. Для меня он стал делом и смыслом жизни. Свою лепту в эту красоту внесли коллектив и бывший заместитель директора Белорусского НИИ плодоводства Н.Капичникова, доктор сельскохозяйственных наук В.Матвеев, а также Э.Бурова, Н.Романюк, Г.Ковальчук и другие беспокойные и бескорыстные люди. Уже несколько лет они и все новые энтузиасты, в их числе и молодые, приходят весной и осенью в наш сад на субботники с саженцами деревьев и кустов, ухаживают за посадками, убирают мусор.

Нынче 26 апреля в Саду Надежды — день роз. Геннадий Грушевой пригласил всех желающих на акцию "Розы детям Чернобыля" в память юных, так и не ставших взрослыми по вине Чернобыля. Наши земляки вместе с друзьями из Швейцарии, Германии, Норвегии, Шотландии, Италии посадят десятки розовых кустов, которые будут говорить нам, как прекрасна жизнь и как всем вместе нужно ее беречь.

Вера СИДЕНКО,
кандидат биологических наук,
садовник Сада Надежды.

Минск.



На снимке: *когда зацветает сакура... Вера Трофимовна Сиденко (вторая слева) со своими помощниками.*

ФИНАНСЫ

Непуганых вкладчиков научат бояться

Юлия ШАРОВА

Нацбанк опять понизил базовую ставку рефинансирования. С 21 апреля она составляет 35 процентов годовых. Это ниже запланированного уровня инфляции, который в нынешнем году не должен превысить 24 процента, поэтому ставки по вкладам для населения останутся положительными. Впрочем, цены в первом квартале росли быстрее, чем того хотелось бы правительству, что заставляет некоторых осмотрительных вкладчиков с меньшим энтузиазмом реагировать на предложения государства хранить деньги в банках.

По данным Министерства статистики и анализа, темп роста потребительских цен в январе составил 4,3 процента, в феврале — 1,9 процента, а в марте он уменьшился до 1,8 процента. В апреле—мае, по прогнозу Министерства экономики, увеличения инфляции не ожидается. Как сообщили БелаПАН в управлении информации Нацбанка, реальное значение базовой ставки рефинансирования по итогам января—марта было положительным, то есть превышало темп роста потребительских цен. Исходя из этого, и принято решение об очередном снижении базовой ставки рефинансирования и учетной ставки Национального банка Беларуси. Прежняя их величина — 37 процентов годовых — действовала с 21 марта 2003 года.

Понижение ставки рефинансирования с 37 до 35 процентов годовых позволяет по-прежнему оберегать вклады населения в белорусских рублях от обесценивания, считают в Нацбанке. На конец 2003 года ставка рефинансирования в Беларуси должна составить 28—32 процента годовых.

Вместе с тем снижение ставки означает удешевление банковских кредитов для предприятий. Надо сказать, что именно необходимость выдавать заводам и колхозам кредиты движет властями при очередном снижении базовой ставки. Год назад, когда ставка рефинансирования составляла 55 процентов, Александр Лукашенко заявил, что кредиты для предприятий слишком дорогие — и ставка мгновенно снизилась на 5 процентов.

Между тем очередное снижение может действительно отпугнуть потенциальных вкладчиков. Известно, что в первые месяцы этого года население не столь активно несло деньги в банки, нежели еще год назад. А теперь, если рассудить трезво, откуда населению взять лишние деньги, которые можно положить в банк?

Наиболее стабильно получающие деньги от государства пенсионеры еще могут соблазниться всякими льготными вкладами. Но люди трудоспособного возраста предпочитают хранить лишние деньги в чулках, предварительно переведя рубли в доллары. "Зеленые" чулки уж точно не лопнут по всем швам, а вот с банками такое может случиться. Особенно, если они активно выдают заведомо невозвратные кредиты трижды убыточным колхозам.

Угроза когда-нибудь не справиться со своими обязательствами перед вкладчиками из года в год висит над всеми полугосударственными банками страны, но каждый год их спасает лишь слепое доверие граждан. Слава Богу, у нас пока не бросаются забирать свои вклады, хотя доля депозитов "до востребования" довольно велика, что представляет опасность. Ведь аппетиты так называемого сектора растут обратно пропорционально его развитию — деньги собственно в банках долго не задерживаются, а идут сразу в дело, на кредиты. Однако население об этом не догадывается.

Тем временем перед главными, системообразующими банками (так называемая "шестерка банков") страны еще в первом квартале была поставлена амбициозная задача — разработать комплексные программы привлечения денежных средств населения на 2003—2005 годы. Такое поручение дано правлением Национального банка. Эти кредитно-финансовые учреждения должны работать над тем, чтобы качество обслуживания клиентов приблизилось к международному уровню. Им также предложили осваивать прогрессивные виды банковских услуг и технологий. Кроме того, системообразующим банкам рекомендовано поддерживать удельный вес средств населения в размере не менее 30 процентов от общей суммы привлеченных ресурсов. Не менее 10 процентов от общего объема кредитования должны составить кредиты населению.

("Белорусские новости".)

ГРОМКОЕ ДЕЛО

Михаил ЛЕОНОВ:

«Обвинение представляет собой бульварный детективчик»

Вчера в Верховном суде, высказывая свое отношение к предъявленным обвинениям, бывший генеральный директор Тракторного завода Михаил Леонов обвинял следствие в фальсификации фактов и благодарил А.Лукашенко за поддержку.

Публикуем фрагменты выступления в суде М.Леонова.

"Узурпировав Конституцию Беларуси, законы Беларуси и реальное состояние дел в экономике нашей страны в период с 1996-го по 2001 год, следствие пытается любой ценой создать из меня образ народного врага, который, якобы создав преступную группу, отнял все добро народа, нажитое им нелегким трудом, — заявил Леонов. И продолжил:

— Должен констатировать, что свои обвинения следствие строит исходя из неквалифицированного понимания функций генерального директора ПО "МТЗ" по управлению машиностроительным комплексом с численностью работающих более 20 тысяч.

...Завод работал в непростых условиях... Работал убыточно (9,4%). Убыток от реализации продукции составил 89 миллионов долларов при затратах на его производство 105 миллионов долларов.

...Вот с таким состоянием я принял завод 10 октября 1995 года.

Это была непростая ситуация.

Только благодаря поддержке президента Республики Беларусь и слаженной работе руководства МТЗ, его высокому профессионализму, ситуация не вышла из-под контроля...

Начиная с 1996 года, положение на заводе начало стабилизироваться".

Далее Михаил Леонов очень подробно рассказывал об успехах, которых достиг Тракторный завод под его руководством. Из-за нехватки газетной площади мы не приводим эту часть его выступления, хотя обязательно вернемся к ней в последующих публикациях.

"...Однако успехи МТЗ следствие не интересовали, так как перед ними стояла иная задача — облить грязью генерального директора и сделать его преступником.

...Реализацию своей управленческой политики генеральный директор осуществлял через профильных директоров, которым он выделял в управление необходимые ресурсы для реализации поставленных перед ними задач... Гендиректор лично не занимался заключением договоров на материально-техническое обеспечение потребностей завода и их реализацией. Он не мог этого делать, так как все ресурсы им были переданы в управление соответствующему директору, который и осуществлял управление этими ресурсами в интересах МТЗ и в рамках утвержденных гендиректором экономических параметров...

В случаях, когда у этого должностного лица наступал период, что он не мог исполнить свои задачи, так как у него не было достаточного объема средств, или он не мог исполнять установленные гендиректором параметры, он обязан был обратиться к гендиректору за выделением ему дополнительного объема ресурсов или изменения экономических нормативов и т.д., с аргументированным обоснованием своей просьбы.

Таким образом, гендиректор ни теоретически, ни практически не мог осуществлять исполнение обязанностей своих заместителей и профильных директоров.

В этой связи все обвинение надумано следствием, не соответствует действительности, фальсифицировано с помощью домыслов, лжесвидетельств и подтасовок и представляет собой бульварный "детективчик".

Увлекшись борьбой с мнимым преступником, следствие сделало нормой своих действий грубое нарушение и пренебрежение законами Республики Беларусь.



Меня лишили права на защиту. Весь срок содержания под стражей, а это один год и четыре месяца, я не понимаю, в чем обвиняюсь и какое преступление я совершил.

Весь этот период следствие издевается и терроризирует мою семью.

Беззаконие, бестактность и грубость следствия неоднократно укладывали мою жену на больничную койку.

Следствие дошло до того, что совершало похищение моей несовершеннолетней дочери Алеси из института и в стенах прокуратуры устраивало над ней издевательства, как "гестаповцы", требуя от нее подписать постановление на допуск в квартиру в отсутствие отца и матери. Мои жалобы в Генеральную прокуратуру РБ остались без необходимого реагирования, так как дальше руководителя следственной группы они не ушли, а он поощрял эти действия, так как ему нужен был результат, а методы получения его не интересовали.

За время нахождения в СИЗО я написал более 50-ти жалоб, столько же ходатайств на неправомерные действия следствия, однако ни одна из них не была удовлетворена, что свидетельствует о предвзятости и необъективности следственной группы.

Добывая факты для обвинения меня любой ценой, следствие организовало ложь и клевету на меня через средства массовой информации, а обращаясь в иностранные компетентные органы, открыто утверждало о том, что я совершил преступления, и перечисляли весь Уголовный кодекс РБ.

Представляя меня как международного преступника, следствие грубо нарушало Конституцию РБ и нанесло моей репутации непоправимый ущерб.

Рассчитывая на безнаказанность, следствие с легкостью подделывало документы, дабы фальсифицировать факты выдуманных преступлений.

Ложь, которую лил на меня руководитель следственной группы И.И.Бранчель, получила такие размахи, что даже без труда стала представляться президенту страны.

Трудно найти ответ на вопрос, чем руководствовалось следствие и лично руководитель следственной группы И.И.Бранчель, поставляя президенту страны ложь и клевету, но ясно одно, что он совершал преступление и дискредитировал Конституцию нашей страны и Прокуратуру РБ.

...Руководитель следственной группы, наверное, свято веря в свою безнаказанность, не гнушается в своих методах. Чудовищность своих обвинений он подкрепляет обвинением о наличии счетов в Германии и наличием на них 20 млн. долларов США, при этом 4 млн. долларов США на них поступает тогда, когда я находился на "нарах", т.е. в 2002 году. Следует отметить изобретательность И.Бранчеля в том, что шум есть, а денег нет: ни тех, что якобы поступали на мои счета в период с 1997 по 2000 год, ни тех, что поступили в 2002 году, когда я сидел на "нарах". Странно, где же они делись и кто управлял столь солидным ресурсом?

...О том, что дело в отношении меня сфальсифицировано на 100%, свидетельствует и тот факт, что 7 февраля 2003 года, когда материалы уголовного дела были уже в суде, ко мне в СИЗО-1 явился руководитель следственной группы И.И.Бранчель и предложил мне признаться в предъявленных мне обвинениях взамен на условное осуждение меня.

Свое предложение он излагал от имени руководства Прокуратуры РБ с угрозой, что, если я не приму их предложение, они сгноят меня в тюрьме. Его угроза была усилена тем, что следом за мной на тюремные нары он поместит мою жену и моих дочерей.

Я отказал Бранчелю в этой сделке, т.к. считаю себя невиновным, что привело его в ярость, и он ушел.

Однако свои угрозы он претворяет в жизнь, терроризируя мою семью: жену и дочерей. После этого он уже неоднократно вызывал мою жену и дочерей на допросы, требуя от них какого-то признания, под угрозой расправы над ними и мной.

Ни я, ни моя семья не можем вступать в сделку с... Я обращаюсь к Верховному Суду Республики Беларусь с просьбой защитить мою семью от беззакония, которое творит вот уже год и четыре месяца представитель закона — Бранчель.

Я обращаюсь к президенту РБ и прошу: Александр Григорьевич, остановите беспредел, который творит следствие в отношении моей семьи и меня!

...Заявленные мне гражданские иски считаю абсурдными, незаконными и необоснованными.

Я надеюсь на беспристрастный и справедливый суд в отношении меня".

Выслушав речь обвиняемого Леонова, суд перешел к его допросу.

Марина КОКТЫШ.
Фото IREX/Promedia.

СЛЫШАЛИ?

В Беларуси создается специальное оружие

Из информационных источников, близких к Министерству обороны и военно-промышленному комплексу, стало известно о разработке в Беларуси принципиально новой модели снайперской винтовки. На данный момент единичный экземпляр оружия прошел огневые испытания, в ходе которых продемонстрировал хорошие показатели по точности, кучности и дальности стрельбы, минимальной отдачи. Винтовка способна поражать цели на расстоянии свыше 1 километра различными типами патронов: обычными, зажигательными и трассирующими. Предполагается установление на оружии глушителя и приспособления для стрельбы в ночное время.

Не имея собственного опыта производства стрелкового оружия (в 1996—1997 гг. попытка наладить массовое производство отечественных автоматов потерпела неудачу), белорусские оружейники позаимствовали модель ствола у аналога зарубежной модели, оптический прицел — у немецкой фирмы "Карл Цейс", некоторые элементы ударно-спускового механизма — у российской винтовки СВД. Первоначально выпускаться снайперская винтовка будет небольшими партиями, если не сказать штучными экземплярами. Предположительная цена изделия — от 12 до 14 тысяч долларов. Ее российский аналог, по некоторым сведениям, стоит свыше 20 тысяч "зеленых". По всей вероятности, белорусская винтовка может поступить на вооружение разведывательных подразделений Министерства обороны и антитеррористических структур Комитета государственной безопасности и Министерства внутренних дел. В перспективе разработчики мечтают о налаживании массового выпуска винтовки и реализации ее на внешнем рынке.

Сергей АНИСЬКО.

Они защищают рабочих, а не подрывают государство

Заявление президиума Совета Белорусского профсоюза работников автомобильного и сельскохозяйственного машиностроения

В выступлении на постояннодействующем семинаре руководящих работников республиканских и местных государственных органов по вопросам совершенствования идеологической работы президент Республики Беларусь А.Г. Лукашенко сказал: *"Некоторые профсоюзные лидеры по-прежнему занимаются политикой, относя себя к непримиримой, враждебно настроенной к государству оппозиции. Это руководители отраслевых профсоюзов автомобильного и сельскохозяйственного машиностроения, работников радиоэлектронной промышленности. Они пытаются навязать профсоюзным организациям государственных предприятий свою идеологию.*

С ними власти не по пути. Так зачем же потакать им, позволять втягивать в их личные политические авантюры трудовые коллективы? Что, этого не видит министр промышленности Анатолий Дмитриевич Харлап? Видит, но считает, что профсоюзные дела должна решать Федерация. И происходит подобное уже не один год. Даю вам еще два месяца. Будете готовы доложить раньше — приходите и докладывайте".

Президиум Совета профсоюза расценивает это высказывание, как указание главы государства министру промышленности разобраться с председателем профсоюза работников автомобильного и сельскохозяйственного машиностроения А.И. Бухвостовым и председателем профсоюза радиоэлектронной промышленности Г.Ф. Федыничем и повлиять на отстранение их от занимаемых должностей.

А.И. Бухвостов и Г.Ф. Федынич избраны на свои должности на съездах профсоюзов в соответствии с Уставами этих профсоюзов. В декабре 2002 года пленумы Советов профсоюзов подтвердили им свое доверие.

Профсоюз АСМ, его Совет, первичные организации всегда занимали и занимают активную позицию в обеспечении и соблюдении прав трудящихся, защиты их социально-экономических интересов. В профсоюзах созданы и действуют сильные службы правозащитной работы, охраны труда, обучения и информирования работающих. Нельзя приравнивать активную деятельность профсоюзов, их лидеров по защите людей труда к враждебным действиям в отношении государства.

Между Министерством промышленности, БНПА и Советом профсоюза АСМ установились партнерские отношения, большинство спорных вопросов рассматривались и решались в конструктивном плане, чему свидетельствует подписанное 12 марта 2003 года новое Тарифное соглашение.

Установка в отношении лидеров белорусских профсоюзов, сделанная руководителем государства в докладе, противоречит Конвенциям Международной организации труда №87 и №98 о свободе ассоциаций, ратифицированным в Республике Беларусь, является нарушением принципа социального партнерства, права на свободу объединений (ст.14 и ст.36 Конституции Республики Беларусь).


Президиум Совета профсоюза АСМ считает недопустимым, наносящим серьезный вред социальному партнерству вмешательство государственных и хозяйственных органов во внутренние дела профсоюза, преследование профсоюзных лидеров, требует строгого соблюдения Конституции и законодательства Республики Беларусь, а также выполнения рекомендаций МОТ в отношении прав профсоюзов в Беларуси.

Народная Воля
25 КРАСАВІКА 2003 г.

Набат Чернобыля

Вот уже 17 лет минуло с момента страшной катастрофы, произошедшей на Чернобыльской АЭС. Основной удар ее пришелся на многострадальную Беларусь.

Иван НИКИТЧЕНКО,
профессор,
член-корреспондент
Национальной Академии
наук Беларуси



Загрязнению только радиоцезием подверглось 23 процента территории Беларуси, в том числе около 1,8 млн. гектаров сельскохозяйственных угодий. Практически каждый пятый гектар. Почти полмиллиона гектаров загрязнено радиоактивным стронцием. На этой территории осталось проживать около 1,8 млн. человек, из них почти полмиллиона детей.

Некогда цветущая республика бывшего СССР превратилась в страну экологического бедствия. Губительные последствия катастрофы начинают набирать темпы.

Начну с демографической ситуации. Как известно, нас уже стало менее 10 млн. человек. Ежегодное уменьшение в последние годы составляет по данным НИИ медико-социальной экспертизы и реабилитации порядка 50 тысяч человек. Это почти сельский район. Причины — высокая смертность и низкая рождаемость. В 2001 году умерло 14,2 человека на тысячу жителей, а родилось только 9,2.

Посмотрим на причины смертности. Они такие: заболевание органов кровообращения — 54,9 процента, новообразования (попросту рак) — 14, отравления — 12, болезни органов дыхания и пищеварения — 6,9 процента, по старости — только 8 процентов.

По рождаемости детей на 1 женщину детородного возраста республика перешагнула уже рубеж, за которым начинается вымирание нации. Для нормального воспроизводства нужно каждой женщине иметь в среднем 2,15 ребенка, порог вырождения составляет 1,6 ребенка, а рождается у нас — 1,3 ребенка.

Теперь посмотрим на состояние населения. На начало 2002 года в республике было 406 тыс. инвалидов и ежегодный прирост их в последние 3 года составляет 50—58 тыс. человек. Следует отметить, что 72 процента из них получили инвалидность не по возрасту, а по болезням системы кровообращения (43%), новообразованиям (19,5%), болезням нервной системы. И самое страшное то, что в этой группе населения более 29 тысяч, или 7,2 процента, детей до 18-летнего возраста.

По моему убеждению, это главный критерий оценки последствий катастрофы на Чернобыльской АЭС и ответ на вопрос о том, исчезли ли проблемы, связанные с ней. Главной причиной такой ситуации является глубоко ошибочная государственная политика в отношении людей, пострадавших от чернобыльской катастрофы. Отсюда постоянное сокращение бюджетного финансирования на мероприятия по ослаблению ее последствий, фактическая отмена почти всех льгот пострадавшим от нее, лишение большей части детей возможности пройти хотя бы месячную реабилитацию в здравницах Беларуси.

Произошел развал системы радиационного контроля. Если в 1990 году в системе Госагропрома было 725 лабораторий, контролирующих все производство продуктов питания по технологической цепи от сырья до готового продукта, все колхозные рынки, то сейчас осталось менее одной трети. Из 370 независимых лабораторий института "Белрад" осталось 83. Практически ликвидирован Белорусский научно-исследовательский институт эндокринологии и радиационной медицины, со сложившейся материальной базой и коллективом высокопрофессиональных специалистов.

По мнению ученых физиков, сегодня доля внешнего облучения составляет не более 20% общей дозы, а 80 процентов приносят загрязненные продукты питания. По данным ученых физиков и радиобиологов, удельная радиоактивность тела — более 50 беккерелей на килограмм веса взрослых людей является критической. За этим порогом начинаются все неприятности в виде болезней, перечисленных выше.

В загрязненной зоне люди питаются тем, что вырастили сами, не считаясь со степенью загрязнения. Другого выхода у них нет. Иных продуктов они кушать из-за хронической нищеты не могут. Собственная продукция является источником постоянного внутреннего облучения и производится она в достаточно большом количестве. Так, по данным местных центров радиационного контроля, каждый шестой литр молока значительно превышает допустимые уровни загрязнения. Это в среднем по зоне. В отдельных населенных пунктах и даже районах превышение достигает 14—26 раз.

Естественно, это губительно отражается на здоровье людей. Недаром при медицинском обследовании пяти загрязненных районов Гомельской области в конце 90-х годов из 10 человек только один оказался здоровым. У 6—7 человек имелся целый букет заболеваний, 2—3 страдали острыми заболеваниями. Не лучше и ситуация с детьми. В официальных докладах медиков на парламентских слушаниях Национального собрания Беларуси 15 апреля 2000 года и на научной сессии общего собрания Национальной Академии наук Беларуси 7 декабря 2000 года отмечалось, что число здоровых детей за период, прошедший после катастрофы уменьшилось в четыре с лишним раза: с 85% в 1985 г. до 20% — в 2000 г. Даже в Минске, по результатам измерения цезия-137 в организме детей, проведенного независимыми центрами в 20 школах, только у 10 процентов его содержание было меньше 5 бк/кг, а максимальные величины составляли 700—900 бк/кг.

Аналогичные данные, но меньшие по величине, приводились и пятью годами раньше. Однако руководство республики проигнорировало эти тревожные сигналы и никаких мер по защите от радиации людей, проживающих в загрязненной зоне, не приняло.

Наука к 1990 году имела необходимые разработки. Их результатом явились технологии ведения сельского хозяйства в зависимости от уровней загрязнения почв, позволяющие многократно снизить радиоактивность продуктов питания. Чуть позже появились материалы по использованию пектинов, ускоряющих выведение радиоцезия из организма человека, полученные институтом "Белрад". Но и в этом случае власть имущие оказались глухими и слепыми. Научные рекомендации остались пылиться на полках, а энтузиаст своего дела член-корреспондент Национальной Академии наук Беларуси В.Б.Нестеренко стал завозить пектиновые препараты из Украины, где в отличие от Беларуси было налажено их производство. Но сколько он смог завести, не имея средств?

Поэтому руководству республики следовало бы серьезно повернуться к проблеме защиты людей от радиации и принять необходимые меры. В первую очередь нужно помочь людям вырастить более чистую продукцию растениеводства и животноводства там, где они проживают. Для этого потребуется повторное обследование каждого приусадебного участка и фермерского хозяйства, научно-обоснованные рекомендации по набору культур и сортов, агротехнике их возделывания, соответствующие технологии переработки продукции.

Чтобы практически осуществить это, нужно создать в регионах по четыре малых предприятия: по агротехобслуживанию с полным набором сельскохозяйственной техники с тем, чтобы они по заказу хозяина могли выполнять все работы от вспашки поля до уборки урожая; по переработке зерновых культур, включая обдирку зерна, помол его и выпечку хлебобулочной продукции по заказу хозяина, предприятие по переработке плодоовощной продукции и по переработке продукции животноводства. Оборудование для них выпускается в России и у нас и стоит относительно недорого.

Поскольку денег на оплату их услуг у сельчан нет, то можно вспомнить старый хорошо проверенный опыт и расчет производить частью выращенного урожая, продав которую предприятия покроют свои расходы и получат долю прибыли. От этого жители не пострадают, так как применение научно обоснованных технологий даст существенную прибавку урожая.

Сложнее обстоит дело с приобретением необходимого оборудования и техники. Денег у сельчан на это нет и не будет. Им нужны кредиты. Но получить их они не могут без залога имущества, которого у них тоже нет. Приобретаемое оборудование банки в качестве залога принять по действующим инструкциям не могут. У них нет лицензии на его реализацию. Вот первый искусственный барьер, который нужно снять.

Второй барьер — собственность на землю. Сейчас земля находится в пользовании крестьян. Для того, чтобы он чувствовал себя полным хозяином своего надела, ему нужно передать его в частную собственность и не по последнему указу за выкуп, а бесплатно.

Ведь где сельчанину взять денег при такой нищенской зарплате? Например, в Наровлянском районе за одну сотку требуют платить 16 тысяч рублей, а за усадьбу в 0,5 га — 800 тысяч рублей. Сколько лет понадобится мужику, чтобы заработать эти деньги? Это не проблема для государства и она легко решаема. Не нужно только изыскивать надуманные причины, что люди не хотят брать землю да и в селе не осталось предприимчивых работящих людей, способных взять на себя функции владельцев малых предприятий. Десяток таких найдется в любом хозяйстве.

Видя такое положение, я вынужден был взять на себя и своих коллег разработку конкретного научно-технического проекта по защите людей от внутреннего облучения. В августе—октябре прошлого года он был согласован и одобрен руководством Национальной Академии наук, православной конфессией, всеми институтами, которые могли бы быть задействованы в нем, снабженческими организациями. В октябре проект был направлен в Госкомчернобыля, откуда до сих пор не последовало никакого ответа. Очевидно, все еще сильна старая советская привычка всячески уклоняться от конкретной работы, за которую могут спросить.

Напрашивается еще одна проблема морального плана. Нельзя сказать, что власти совсем забыли о чернобыльской катастрофе. Они вспоминают о ней по крайней мере раз в год. По старой советской методике все учреждения, организации и учебные заведения обязываются привести на площадь Бангалор, именуемую в народе "выгул для собак", определенное количество людей, ссылаясь на то, что там простроена в честь чернобыльского события церквушка.

Здравомыслящая часть населения желает отдать дань памяти досрочно ушедшим из жизни жертвам Чернобыля и выразить свое сочувствие и солидарность пока живым, безвинно пострадавшим от катастрофы. Но власти им всячески препятствуют, ограничивая маршруты следования, запрещая проведение жалобных мероприятий в соответствующих местах Минска и других городов. Вместо содействия проводимым мероприятиям, они выводят на улицы тысячи спецназовцев, которых уже начали в народе называть инопланетянами, заставляют их разгонять мирные шествия, позволяют избивать мирных людей, арестовывать и штрафовать организаторов мероприятий.

Не пора ли задуматься? Ведь всякая власть не вечна. Придет время и за все отвечать перед Богом и людьми.



Фото IREX/ProMedia.

ПУЛЬС

Беларускі металургічны завод пашырае рынак збыту

Беларускі металургічны завод (БМЗ) плануе павялічыць сваю прысутнасць на сусветным рынку металакорду з 7 да 12 працэнтаў. Пра гэта заявіў на прэс-канферэнцыі ў Мінску дырэктар БМЗ Мікалай Андрыянаў.

Цяпер БМЗ пастаўляе металакорд такім вядомым фірмам па вытворчасці аўтамабільных шын, як "Кантыненталь", "Гудзіер", "Пірэлі", "Мішлен", "Данлоп" і "Зімперыт".

У мэтах прасоўвання на сусветны рынак беларускага металакорду ў Германіі, Аўстрыі і ЗША ўжо створаны сумесныя прадпрыемствы. У маі 2003 года прадстаўніцтва БМЗ пачне працу ў Шанхаі (Кітай). На пачатковым этапе працы сумеснага прадпрыемства ў Шанхаі з-за больш таннай металургічнай прадукцыі на кітайскім рынку БМЗ "пойдзе на нулявую рэнтабельнасць, для таго каб пацяху ўкараніцца ў кітайскі і паўднёва-ўсходні рэгіён, якія зараз вельмі актыўна развіваюцца", паведаміў М.Андрыянаў.

Генадзь ШАРЫПКІН.

Доступ у Інтэрнет будзе ў кожным райцэнтры

Сёлета Рэспубліканскае аб'яднанне "Белтэлекам" працягне працу па рэканструкцыі і мадэрнізацыі магістральных ліній сувязі з выкарыстаннем абсталявання перспектыўных тэхналогій і будаўніцтва ўнутрыабласных сетак сувязі.

У снежні падключаны другі маршрут доступу на знешні Інтэрнет праз амерыканскую кампанію "Спрынт", дзякуючы чаму аб'ём прапускной здольнасці каналаў для Беларусі пашырыўся да 79 мегабіт у секунду.

Ірына САЗАНОВІЧ.

Пасадзяць 15.000 дрэў

У 2003 годзе ў Мінску будзе пасаджана каля 15 тысяч дрэў, 67 тысяч кустарнікаў, больш за мільён кветак 60 відаў, створана 70 гектараў газону. Афармленне зялёных зон, у тым ліку з элементамі ландшафтнай архітэктуры, запланавана ў кожным раёне горада.

На плошчы Перамогі і ля Опернага тэатра будуць створаны традыцыйныя дывановыя кветнікі, а для плошчы Незалежнасці распрацаваны новы план па высадцы пунсовых цюльпанаў.

Лавінія АРЭШКА.

У Мінску — «Шэдэўры Траццякоўскай галерэі»

У Нацыянальным мастацкім музеі ў Мінску адкрылася выстава "Шэдэўры Траццякоўскай галерэі".

На выставе прадстаўлена 60 жывапісных палотнаў вядомых рускіх мастакоў XVIII — пачатку XX стагоддзя з асноўнай экспазіцыі і фондаў музея. Такі вернісаж па-за сваімі сценамі Траццякоўка ладзіць упершыню. Прычым пры падрыхтоўцы выставы, у якой прадстаўлены творы, што складаюць мастацкую славу і гонар рускага і еўрапейскага мастацтва, улічваліся ўсе пажаданні беларускага боку.

Выстава прадоўжыцца да 26 верасня.

Марат ГАРАВЫ.

Чытайце амерыканскія кнігі

23 красавіка ў Міжнародны дзень кнігі і абароны аўтарскіх правоў пасол ЗША ў Беларусі Майкл Козак перадаў у дар Мінскай абласной бібліятэцы імя Пушкіна чарговую калекцыю амерыканскай літаратуры.

У яе ўвайшлі кнігі вядомых амерыканскіх пісьменнікаў, публікацыі са штогадовай серыі "Лепшыя амерыканскія апавяданні", а таксама п'есы, вершы, літаратурная крытыка, анталогіі і энцыклапедыі, біяграфіі амерыканскіх і сусветных аўтараў. Калекцыя ўключае 950 кніг агульным коштам 2.850 долараў ЗША.

Юлія ЦЯЛЬЦЕЎСКАЯ.

Адкрываюць медвыцвярэзнікі

Да канца красавіка ў буйных гарадах Віцебскай вобласці пачнуць працаваць медвыцвярэзнікі. Пра гэта паведаміў начальнік УУС Віцебскага аблвыканкама Вячаслаў Яўстаф'еў, каменціруючы праблему злачынстваў, учыняемых грамадзянамі ў стане алкагольнага ап'янення.

Як лічыць начальнік УУС, рашэнне аб закрыцці медвыцвярэзнікаў было звязана са смяротнасцю ў гэтых спецыялізаваных установах. Паколькі ў іх штаце знаходзіўся толькі адзін фельчар, не заўсёды ўдавалася своечасова аказаць дапамогу грамадзянам, якія знаходзіліся ў стане моцнага алкагольнага ап'янення.

Аднак пасля закрыцця медвыцвярэзнікаў у Віцебску павялічылася колькасць злачынстваў, учыняемых грамадзянамі ў стане алкагольнага ап'янення.

Пасля абмеркавання гэтай праблемы з кіраўніцтвам вобласці прынята рашэнне аднавіць працу медвыцвярэзнікаў. Ужо ў гэтым месяцы яны павінны адкрыцца ў Віцебску, Полацку, Наваполацку і Оршы.

Сяргей КОЧАТАЎ.

А.Хусаенаў — «Персона года 2002». У Расіі

Кіраўнік міжнароднага аўтамабільнага холдынгу "Атлант-М" Алег Хусаенаў стаў лаўрэатам прэстыжнага расійскага конкурсу "Персона года 2002".

А.Хусаенаву ўручана прэмія ў намінацыі лідэр галіны "Аўтамабільная дыстрыб'юцыя" за самыя буйныя інвестыцыі ў развіццё аўтамабільных дыстрыб'ютэрскіх сетак. Лаўрэатаў конкурсу "Персона года" вызначыў экспертны савет, у склад якога ўвайшлі вядомыя грамадскія дзеячы, прадстаўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, кіраўнікі расійскіх кампаній і сродкаў масавай інфармацыі. Цырымонія ўзнагароджвання прайшла ў Крамлі.

Холдынг "Атлант-М" — адна з найбуйнейшых аўтамабільных кампаній на рынку Беларусі, а таксама СНД у цэлым, якая спецыялізуецца на продажы, гарантыйным і сэрвісным абслугоўванні аўтамабіляў розных марак, а таксама на продажы запасных частак.

Аляксей АРЭШКА.

Пчолам не стала жыцця

Падобна на тое, што пчалярству як традыцыйнай для Беларусі гаспадарчай галіне настаў канец. На Віцебшчыне, якая яшчэ нядаўна славілася здабыткамі пчаляроў, з кожным годам скарачаецца колькасць пасек.

Летась у гаспадарках вобласці налічвалася 4,3 тысячы пчоласем'яў, а напярэдадні сёлетняй вясны іх стала 4,1 тысячы. У Лепельскім, Лёзненскім, Ушацкім і Чашніцкім раёнах наогул не засталося пасек. Вынікам гэтага будзе не толькі дэфіцыт мёду, але і скарачэнне ўраджаяў тых сельскагаспадарчых культур, якія апыляюцца пчоламі. Вобласць недаатрымае шмат насення канюшыны, зерня грэчкі, значнай колькасці садавіны і агародніны.

Каб хоць неяк паправіць становішча, аблвыканкам, няхай і са спазненнем, вырашыў прыняць пэўныя меры для падтрымкі пчалярства. Вырашана, што на барацьбу з хваробамі пчол упраўленню ветэрынарыі будзе штогод выдзяляцца па 3 мільёны рублёў.

На жаль, пакуль гэтыя грошы дойдуць да мэты, ад іх мала што застанецца з-за інфляцыі.

У яшчэ горшым стане апынуліся пчаляры-прыватнікі, якія пазбаўлены магчымасці набываць цукар па меншай цане, чым у магазінах, купляць па льготных цэнах вашчыну і іншыя матэрыялы, неабходныя для ўтрымання пасек. Нядзіўна, што мёд на рынках пастаянна становіцца даражэй, а колькасць пчаляроў скарачаецца.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

Спажываем радыенукліды

За постчарнобыльскі перыяд дзевяць разоў зніжаліся нарматывы ўтрымання радыенуклідаў у прадуктах харчавання. Пра гэта паведаміла намеснік начальніка аддзела Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Зінаіда Басалаева ў Мінску на прэс-канферэнцыі, прысвечанай праблемам рэабілітацыі забруджаных тэрыторый і радыяцыйнай абароны насельніцтва.

Паводле яе слоў, нават пры пастаянным узмацненні кантролю ўзроўняў утрымання радыенуклідаў у прадуктах харчавання ў грамадскім сектары за апошнія 10 гадоў удалося ў 5,6 раза скараціць вытворчасць бруднага малака і поўнасцю выключыць пастаўкі спажыўцу забруджанага радыяцыяй мяса. Прычым, як падкрэсліла спецыяліст, забруджаная радыенуклідамі прадукцыя не выкарыстоўваецца ў харчовых мэтах.

З.Басалаева паведаміла, што з 1996 па 2002 гады колькасць гаспадарак, дзе выпрацоўвалася забруджаная цэзіем-137 сельгаспрадукцыя скарацілася з 219 да 99, а забруджаная стронцыем-90 — павялічылася з 58 да 65. "Гэта звязана з тым, што гадамі згаданы радыенуклід становіцца ўсё больш "даступным" для прадукцыі сельскай гаспадаркі", — заўважыла спецыяліст.

Марат ГАРАВЫ.

Сабралі грошы ў нямецкім тэатры

Журналіст Лотар Эверс заснаваў у Кёльне дабрачынную арганізацыю "Нямецкі саюз інфармацыі і падтрымкі рэпрэсіраваных фашыстамі".

Арганізацыя выпускае часопіс "Перажытае...", у якім падаецца разнастайная інфармацыя аб зверствах фашыстаў у час апошняй вайны, аб жыцці былых вязняў фашысцкіх лагераў. Часопіс даводзіць да свядомасці нямецкай грамадскасці віну Германіі ў развязванні вайны і гібелі мільёнаў бязвінных людзей. Праз гэты часопіс арганізацыя збірае сродкі для аказання дапамогі былым пакутнікам.



Нямецкая дэлегацыя ў Мінску. Першы злева — Ганс Кісайер, трэці справа — Лотар Эверс.


У мінулым годзе разам з Кёльнскім драматычным тэатрам (рэжысёр Ганс Кісайер) пастаўлена п'еса вядомага нямецкага драматурга Петэра Вайса "Расследаванне" — пра суд над былымі катамі канцлагера Асвенцім. Раз на тыдзень п'еса ідзе ў зале Кёльнскага універсітэта. Сабраныя з гледачоў грошы нямецкая дэлегацыя нядаўна прывезла ў Мінск для аказання дапамогі былым вязням Асвенціма.

Яўген СТАСЕВІЧ,
былы вязень фашысцкіх лагераў.

НЕЗАЛЕЖНАЯ ЭКСПЕРТЫЗА

Ману не схаваеш

Уладзімір КУЛАЖАНКА,
прафесар,
доктар
эканамічных навук



На мінулым тыдні на пасяджэнні ўрада пад старшынствам прэм'ера Генадзя Навіцкага вырашана перайсці да аптымальнай сістэмы сацыяльнага страхавання. З будучага года трэба, маўляў, папоўніць індывідуальныя страхавыя рахункі, падзяліць іх на пенсійнае і сацыяльнае страхаванне. Мэта — аслабіць напружанне ў фарміраванні пенсійных фондаў і выплаце пенсій.

А ў гэты час А.Лукашэнка правёў нараду чыноўнікаў, прысвечаную распрацоўцы і ўкараненню адзіных нарматываў сацыяльных стандартаў па абслугоўванні насельніцтва. Гэтыя "стандарты" будуць мець дачыненне да ўзроўню медыцынскіх, бытавых, жыллёва-камунальных паслуг, забяспечанасці грамадскім транспартам. Але як бы ні выстаўляліся сацыяльныя стандарты як форма абароны насельніцтва і як клопат пра яго інтарэсы, гэта выклікана немагчымасцю гарантаваць іх бясплатнасць, поўную даступнасць.

Фактычна ўвядзенне сацыяльных стандартаў скіравана супраць малазабяспечаных, а калі гаварыць горкую праўду — згалелых пластоў насельніцтва. І засцярога А.Лукашэнкі аб тым, што трэба "быць максімальна асцярожнымі з увядзеннем платных паслуг" і што яны "павінны заставацца даступнымі для людзей", бедным людзям не дапаможа.

Ільготы насельніцтву ў розных сферах жыццядзейнасці ўведзены пры Саветах, яны, з аднаго боку, былі звязаны з татальнай галечай насельніцтва, а з другога — адпавядалі інтарэсам наменклатуры, што сядзела каля размеркавальнага карыта, з якога чэрпала спаўна. Зразумела, што ўсялякія льготы трэба ліквідаваць. Але пры адной умове — адпаведным павышэнні заработнай платы, пенсій і стыпендый, каб людзям было чым плаціць.

Сёлетняя актыўнасць чыноўнікаў у сферы размеркавання ёсць толькі працяг аналагічнай палітыкі, якая праводзілася летась. Паводле афіцыйных дадзеных, летась тарыфы на "камуналку" рэзка павысіліся: на газ на 219 працэнтаў, на ацяпленне і гарачае водазабеспячэнне — на 193, электраэнергію — на 146 працэнтаў і г.д. Быў узяты курс на ліквідацыю перакрыжаванага субсідзіравання. Сутнасць апошняга ў тым, што кватэраздымальшчыкі за паліва і энергію плацілі нязначную частку, а выдаткі пакрывалі за іх прадпрыемствы, для якіх тарыфы былі значна вышэйшыя. Але тут хавалася мана, бо высокія тарыфы на энергію ўключаліся ў цэны, якія аплачваліся насельніцтвам. Стваралася ілюзія клопатаў пра простага чалавека. Для такой фальшы ствараліся пэўныя ўмовы, бо ўнутраны рынак не ведаў канкурэнцыі і людзі вымушаны былі плаціць за тыя тавары, якія былі ў крамах. Зараз умовы змяніліся — і ўлады мусілі адысці ад перакрыжаванага фінансавання. Дзякуючы скарачэнню перакрыжаванага субсідзіравання фінансавая нагрузка на прадпрыемствы і бюджэт летась скарацілася на 310 млрд. рублёў. Нібы добра. Але бяда ў тым, што ўсё гэта лягло на плечы працоўных. Нездарма за стандартную аднапакаёвую кватэру трэба плаціць зараз 41 тыс. рублёў, за двухпакаёвую з трыма жыльцамі 59 тыс. рублёў.

Упарадкаванне размеркавальных адносін даўно наспела. Гэта дыктуецца пачаткам увядзення рыначных стасункаў і канкурэнцыі, але на гэтую праблему трэба глядзець глыбей і грунтоўней. Напрыклад, чаму ў Беларусі толькі 30 працэнтаў створанага ВУП (валавога ўнутранага прадукту) ідзе на зарплату? Ці мае ўрад абгрунтаванне, што пад зарплату можа быць выкарыстана толькі 30 працэнтаў ВУП? У той час як у краінах, якія працвітаюць, на заробкі ідзе 60, а то і 70 працэнтаў ВУП. Ці не таму запасы нерэалізаванай прадукцыі ў нас перавышаюць 1 трлн. рублёў, альбо 70 працэнтаў ад месячнага аб'ёму вытворчасці?

Любы вытворца на Захадзе выпрабляе столькі прадукцыі, колькі яе могуць купіць, бо аб'ём вытворчасці, тэмпы яе росту ўпіраюцца ў заробкі. Значыць, калі хочам забяспечыць рост вытворчасці і павысіць тэмпы эканамічнага развіцця, трэба аптымальна павышаць заработную плату. Аптымальна ў тым сэнсе, што яе рост не павінен перавышаць рост прадукцыйнасці працы, але не можа і адставаць.

Недасканаласць арганізацыі заработнай платы спараджае тупік у развіцці шмат якіх галін вытворчасці. Чаму, напрыклад, стагнацыя ахапіла жыллёвае будаўніцтва? Таму, што сярэдняя заработная плата — 115 умоўных адзінак — не дазваляе збудаваць паўквадратнага метра жылля. У сваю чаргу тупік у жыллёвым будаўніцтве механічна перакідваецца ў мэблевую прамысловасць.

Здаецца, навучыліся выпрабляць якасную і прыгожую мэблю з дрэва ды іншых сучасных матэрыялаў, а на рынку яна запатрабуецца вельмі слаба. Бо няма каму і за што купляць. І куды ставіць яе? І такую логіку залежнасці развіцця вытворчасці ад нізкіх даходаў насельніцтва можна праілюстраваць на шматлікіх прыкладах.

З якога боку ні паглядзі, сённяшнія размеркавальныя адносіны ў краіне вядуць да крызіснага стану ў эканоміцы. Перш за ўсё аб гэтым сведчаць паказчыкі дзяржаўнага бюджэту. Калі ўзяць дадзеныя фарміравання даходнай часткі бюджэту, якая складае 6104,5 млрд. рублёў, то толькі 10 працэнтаў гэтага даходу (602,8 млрд. рублёў) фарміруюць падаткі на прыбытак і толькі крыху болей за 5 працэнтаў — падаткі з фонду заработнай платы. А ў гэты час 2670,7 млрд. рублёў, больш за 40 працэнтаў, паступае ад унутраных падаткаў на тавары і паслугі, гэта значыць, ад вельмі нізкіх заробкаў. Тым больш што з гэтай сумы 1,9 трлн. рублёў складае падатак на дабаўленую вартасць як прамы вылік праз цану з даходаў працоўных.

Што можа быць вынікам такой практыкі фарміравання даходнай часткі бюджэту? Толькі адно — абмежаванне пакупніцкай здольнасці насельніцтва і тармажэнне эканамічнага развіцця.

Адмоўнае ўздзеянне фарміравання даходаў бюджэту на эканоміку толькі ўзмацняецца размеркаваннем бюджэтных даходаў. Прывядзём некалькі лічбаў. Выдаткі на нацыянальную абарону — 299,7 млрд. рублёў плюс пенсіі і дапамога ваеннаслужачым — 254,5 млрд. рублёў складуць разам 554,2 млрд. рублёў, што болей, чым па любым артыкуле сацыяльнага ці вытворчага значэння. Калі ж да гэтага дадаць выдаткі на праваахоўную дзейнасць — 508,9 млрд. рублёў разам з пенсіямі і дапамогамі ў праваахоўных органах (63,4 млрд. рублёў), то агульная сума выдаткаў на абарону і праваахоўную дзейнасць дасягае агромністай велічыні — 1 трлн. 126,5 млрд. рублёў.

Гэта значыць, пятая частка даходаў бюджэту ідзе міма рэальнага сектара. Затое капіталаўкладанні (397 млрд. рублёў), ахова здароўя (377 млрд. рублёў) і адукацыя (402,5 млрд. рублёў) не дасягаюць разам выдаткаў на абарону і праваахоўнікаў.

Зразумела, што слабая эканоміка краіны не можа вытрымаць ні вайсковай, ні міліцэйскай мілітарызацыі. Вось чаму ўраду даводзіцца займацца скарачэннем ільгот, пошукам сацыяльных стандартаў, ростам жыллёвых тарыфаў і г.д. Але станоўча паўплываць на эканоміку гэта не ў стане.

Як бачым, размеркавальныя адносіны, як на макра-, так і на мікраўзроўні, не адпавядаюць задачам пераадолення крызісных з'яў у эканоміцы і росту дабрабыту людзей.

ЗА СВОБОДНОЕ ПРОЦВЕТАЮЩЕЕ ОБЩЕСТВО

РОО «Белорусский Хельсинкский комитет» готовится представить общественности доклад о выборах депутатов местных Советов XXIV созыва



